**Коммуникативная** компетенция: принципы, методы, приемы
К63 формирования: сб. науч. ст. / Белорус.гос.ун-т; в
авт. ред. – Мн., 2009. – Вып. 9. – 102 с.

***В. У. Праскаловіч***

# ТЭХНАЛОГІЯ ДЫСТАНЦЫЙНАГА НАВУЧАННЯ Ў СІСТЭМЕ ФІЛАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Найважнейшая рыса сучаснай сістэмы вышэйшай адукацыі – яе накіраванасць на тое, каб падрыхтаваць студэнтаў да ўспрымання сацыяльных змен. Гэтыя адукацыйныя арыенціры ў пачатку 90-ых гг. атрымалі міжнароднае прызнанне ў праграмах ЮНЕСКА. Сёння цяжка ўявіць, каб навучанне зводзілася да простай рэпрадукцыі, а яшчэ больш нерэальна ўявіць яго на чыста даследчай аснове. У сучаснай дыдактыцы ўсё большае распаўсюджанне атрымлівае арыентацыя на інавацыйны тып навучання.

Катэгорыя навізны адносіцца не столькі да часу, колькі да якасных рыс змен, якія надаюць навучанню мэтавую арыентацыю, пераўтвараюць характар узаемадзеяння выкладчыка і студэнта. Аналіз сітуацыі ў розных краінах паказвае, што інавацыйныя працэсы там маюць падобныя рысы. У гэтых умовах традыцыйная сістэма вышэйшай адукацыі не можа заставацца нязменнай. Яна патрабуе мадэрнізацыі. Спробы пераўтварыць традыцыйнае навучанне звязаны з пошукамі дыдактычнага забеспячэння адукацыйнай сферы вышэйшай школы. Таму ўзнікла вострая патрэба ў новых метадалагічных падыходах да распрацоўкі найноўшых інфармацыйных тэхналогій і інфармацыйных тэхнічных сродкаў, галоўным чынам у распрацоўцы і ўкараненні мультымедыйных тэхналогій і дыстанцыйнага навучання, а таксама метадаў пабудовы аптымальнай структуры вучэбнай інфармацыі, яе камунікацыйных складнікаў і метадаў яе вымярэння.

У артыкуле зроблена спроба прапанаваць асноўныя падыходы да рашэння дадзенай праблемы на прыкладзе дыстанцыйнага навучання.

Дыстанцыйнае навучанне, па сутнасці, гэта новая эфектыўная форма навучання з выкарыстаннем ПЭВМ, электронных падручнікаў і сеткі Інтэрнэт.

Дыстанцыйнымі прынята лічыць такія формы навучання, якія даюць магчымасць выключыць непасрэдны асабісты кантакт выкладчыка са студэнтамі (або значна абмежаваць), незалежна ад прыроды прымянення тэхнічных і іншых сродкаў. Прычым задача выключэння асабістага кантакту не з’яўляецца асноўнай мэтай пабудовы працэсу навучання. Акрамя таго, як лічыць большасць вучоных [1, 2, 3 і інш.], выкарыстанне тэрміна "дыстанцыйнае навучанне" не зусім карэктна, а лепш аперыраваць паняццем: "дыстанцыйная падрыхтоўка" або "дыстанцыйная адукацыя". Гэта абумоўлена тым, што ніякая тэхнічная або праграмная сістэма на сённяшні дзень не можа ўлічыць псіхалагічных фактараў працэсу навучання.

У сілу спецыфікі прафесійнай падрыхтоўкі, якая патрабуе якаснага ацэньвання засвоеных ведаў і ўменняў, тэхналогія дыстанцыйнага навучання не можа быць выкарыстана як адзіная адукацыйная тэхналогія і найбольш мэтазгодна разглядаць яе як дадатковы сродак.

Па арганізацыі вучэбнага працэсу дыстанцыйнае навучанне найбольш блізкае да завочнай формы навучання. Аднак нягледзячы на шматгадовы вопыт функцыянавання сістэмы завочнай падрыхтоўкі спецыялістаў, на наяўнасць спецыяльных вучэбна-метадычных комплексаў для самастойнага навучання студэнтаў застаецца нявырашанай праблема выкарыстання сродкаў навучання ў вышэйшай школе. У традыцыйным вучэбным працэсе такімі сродкамі з’яўляюцца: друкаваныя выданні падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, даведнікаў, дыскеты з вучэбнай інфармацыяй, запісы на дошцы, плакаты, кінафільмы, відэафільмы, а таксама слова выкладчыка. У сістэме дыстанцыйнай падрыхтоўкі спецыялістаў сродкаў навучання значна больш і, акрамя традыцыйных, уключаюць такія, як:

- вучэбныя электронныя выданні;
- камп’ютэрныя адукацыйныя сістэмы; аўдыё-, відэавучэбныя матэрыялы;
- камп’ютэрныя сеткі і г. д.

*Электронныя выданні вучэбнага прызначэння*, якія ўключаюць усе асаблівасці папяровых выданняў, аднак маюць шэраг станоўчых адрозненняў і пераваг. У прыватнасці:

- кампактнасць захоўвання ў памяці камп’ютэра або на дыскеце;
- гіпертэкставыя магчымасці, мабільнасць, тыражуемасць;
- магчымасць аператыўнага ўнясення змяненняў і дапаўненняў;
- зручнасць перасылкі па электроннай пошце.

Складовымі часткамі электроннага курса могуць быць: электронны канспект лекцый (апісанне тэарэтычных пытанняў па вывучаемай дысцыпліне); інтэрактыўны задачнік (зборнік задач для самастойнага практычнага рашэння); віртуальны лабараторны практыкум (інструкцыя да лабараторных работ і іх камп’ютэрная імітацыя); форум (сродак атрымання індывідуальнай або калектыўнай кансультацыі ў выкладчыка або абмеркаванне пытанняў паміж студэнтамі); прамежкавы тэст (складаецца з тэставых і тэматычных заданняў па кожным раздзеле тэарэтычнага лекцыйнага матэрыялу і прызначаны найперш для самаправеркі студэнтамі або праверкі выкладчыкам іх ведаў і ўменняў); калёквіум (мяркуемыя індывідуальныя адказы студэнтаў на пытанні выкладчыка); выніковы тэст (складаецца аўтаматычна з пытанняў усіх прамежкавых тэстаў электроннага падручніка і служыць для правядзення выніковага заліковага мерапрыемства па вучэбнай дысцыпліне).

*Камп’ютэрныя адукацыйныя сістэмы* – праграмныя сродкі вучэбнага прызначэння, якія шырока выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе дыстанцыйнай падрыхтоўкі і дазваляюць:

- індывідуалізаваць падыход і дыферэнцаваць працэс навучання;

- кантраляваць навучаемага з дыягностыкай памылак і зваротнай сувяззю;
- забяспечыць самакантроль і самакарэкцыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;
- дэманстраваць візуальную вучэбную інфармацыю;
- мадэляваць і імітаваць працэсы і сітуацыі;
- фарміраваць уменне прымаць аптымальныя рашэнні;
- павышаць цікавасць да працэсу навучання, выкарыстоўваючы гульнёвыя педтэхналогіі;
- развіваць інтэлектуальны, творчы патэнцыял, аналітычнае мысленне, самастойнасць студэнта і інш.

*Аўдыё- і відэавучэбныя матэрыялы* – запісваюцца на магнітныя носьбіты, аўдыё- і відэакасеты, і могуць быць прадстаўлены студэнту з дапамогай магнітафона, відэамагнітафона або лазерных кампакт-дыскаў CD-ROM.

*Камп'ютэрныя сеткі* – сродак навучання, які ўключае ў сябе рознага роду інфармацыю і сукупнасць камп'ютэраў, аб'яднаных каналамі сувязі.

Глабальная сетка Інтэрнэт – інтэгральны сродак, які шырока выкарыстоўваецца ў дыстанцыйнай падрыхтоўцы. З'яўленне глабальнай сеткі Інтэрнэт стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця дыстанцыйнага навучання. Дыстанцыйная адукацыя пры гэтым набыла ўжо новую якасць – інтэрнацыянальнасць – экспарт і імпарт сусветных дасягненняў на рынку адукацыйных паслуг.

Развіццё глабальных сетак стварыла прынцыпова новую сітуацыю ў рабоце вучоных-педагогаў і студэнтаў з інфармацыяй: многія крыніцы інфармацыі, раней раздзеленыя, сталі даступнымі, прычым дастаткова хутка.

Так, у мэтах падрыхтоўкі спецыялістаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце створана аўтаматызаваная вучэбна-інфармацыйная сістэма арганізацыі дыстанцыйнага навучання. Сістэма прызначана для арганізацыі вучэбнага працэсу студэнтаў дыстанцыйнай формы навучання, а таксама для задавальнення шэрага адукацыйных паслуг студэнтам і слухачам пасродкам карпаратыўнай камп'ютэрнай сеткі і праз Інтэрнэт. На серверах, апроч таго, можна знайсці вялікую бібліятэку электронных кніг і падручнікаў па розных вучэбных дысцыплінах. Надзвычайную ролю ў развіцці дыстанцыйнай адукацыі, на наш погляд, можа і павінен адыграць курс інфарматыкі для вышэйшых навучальных устаноў, які дазволіў бы выпрацаваць тэхналогію кам'ютэрнага навучання з прымяненнем сеткі Інтэрнэт і электронных падручнікаў і арганізацыяй кам'ютэрнай тэхналогіі прыёму і здачы экзаменаў.

У педагагічнай практыцы вышэйшай школы выпрацаваліся шырока вядомыя формы навучання. Найбольш распаўсюджаныя з іх – лекцыі, семінары, лабараторныя заняткі, кантрольныя работы, залікі, экзамены – выкарыстоўваюцца ў дыстанцыйным навучанні, аднак, праяўляючы некаторыя спецыфічныя асаблівасці.

*Лекцыі,* у адрозненне ад традыцыйных аўдыторных, выключаюць непасрэдны кантакт выкладчыка са студэнтамі, аднак маюць і шэраг пераваг. Для запісу лекцыі выкарыстоўваюцца аўдыё- і відэакасеты, лазерныя кампакт-дыскі CD-ROM. Выкарыстанне найноўшых інфармацыйных тэхналогій (гіпертэкста, мультымедыя, віртуальнай рэальнасці) робіць лекцыі выразнымі і наглядннымі. Для стварэння лекцый можна скарыстаць усе магчымасці кінематографа: рэжысуру, сцэнарый, артыстаў. Такія лекцыі можна слухаць у любы час і на любой адлегласці. Акрамя таго, няма патрэбы ў канспектаванні лекцыйнага матэрыялу.

*Семінары* дыстанцыйнага навучання з'яўляюцца актыўнай формай вучэбных заняткаў. Семінары праводзяцца з дапамогай відэаканферэнцый. Яны дазваляюць уступіць у дыскусію ў любы момант, вярнуцца на некалькі крокаў назад, прачытаўшы папярэднія выказванні. Выкладчык можа ацэньваць засваенне матэрыялу па ступені актыўнасці ўдзельніка дыскусіі. Такім чынам павялічваецца колькасць узаемадзеянняў студэнтаў паміж сабой, а сам выкладчык выступае ў ролі раўнапраўнага партнёра.

*Кансультацыі* з'яўляюцца адной з формаў кіраўніцтва працай навучаемых і аказання ім дапамогі ў самастойным вывучэнні дысцыпліны. Апрача таго, выкарыстоўваецца тэлефон і электронная пошта, а таксама тэлеканферэнцыі: аўдыё-, відэа-канферэнцыі, камп'ютэрныя тэлеканферэнцыі.

*Лабараторныя работы* ў дыстанцыйным навучанні прызначаны для практычнага засваення матэрыялу. У традыцыйнай адукацыйнай сістэме лабараторныя заняткі патрабуюць: спецыяльнага абсталявання, макетаў, імітатараў; трэнажораў, хімічных рэактываў і г. д. Магчымасці дыстанцыйнага навучання ў далейшым могуць істотна спрасціць задачу правядзення лабараторнага практыкума за кошт выкарыстання мультымедыя-тэхналогій, ГІС-тэхналогій (дыдактычныя матэрыялы на аснове геаінфармацыйных сістэм), імітацыйнага мадэлявання і г. д. Віртуальная рэальнасць дазволіць прадэманстраваць навучаемым з'явы, якія ў звычайных умовах паказаць даволі складана або ўвогуле немагчыма.

*Кантроль* дыстанцыйнага навучання – гэта праверка вынікаў тэарэтычнага і практычнага засваення студэнтамі вучэбнага матэрыялу. Агульнапрызнанай формай кантролю з'яўляецца тэставы кантроль. Тэставыя заданні (заданні ў тэставай форме) прызначаны як для тэматычнага або выніковага кантролю за якасцю навучання, так і для абагульнення ведаў навучаемых па пэўнай вучэбнай дысцыпліне. Тэхналагічная методыка тэставання дапускае выразную і хуткую дыферэнцуемасць правільнага адказу ад няправільнага. У гэтым сэнсе традыцыйныя пытанні і адказы не тэхналагічны, асабліва тыя, што маюць "цяжкаважныя" фармулёўкі. "Чым менш слоў, тым менш непаразуменняў" (А. М. Пяшкоўскі).

*Цьютарыялы* – паслядоўна арганізаваныя кансультацыі, назначэнне якіх:

- садзейнічаць актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці слухачоў;
- фарміраваць такія якасці слухачоў, як:

– здольнасць хутка адаптавацца ў групе, занятай рашэннем агульнай для ўсіх задач;

– умене ўстанаўліваць асабістыя кантакты, абменьвацца інфармацыяй і фарміраваць неабходныя пункты погляду, правільна размяркоўваць і арганізоўваць працу;

– умене аналізаваць і ацэньваць дзеянні свае і іншых.

*Цьютарыялы* – спецыфічная і арганізацыйная форма ўзаемадзеяння выкладчыка (цьютара – выкладчыка-кансультанта, надзеленага якасцямі выкладчыка, кансультанта і менеджэра) са слухачамі. Паколькі ў цьютарыяле прысутнічае "вочны" кампанент, да гэтай формы навучання прад'яўляюцца наступныя патрабаванні: распрацоўка праграмы для кожнага цьютарыяла; вызначэнне яго працягласці; распрацоўка структуры цьютарыяла; правядзенне цьютарыяла выкладчыкам і экспертам неабходнай кваліфікацыі, што асабліва важна пры павышэнні кваліфікацыі ў канкрэтнай прафесійнай вобласці.

Важнейшай асаблівасцю арганізацыі цьютарыялаў з'яўляецца выкарыстанне нетрадыцыйных метадаў навучання. Найбольш распаўсюджаныя: дзелавыя і ролевыя гульні, імітацыйныя практыкаванні, групавыя дыскусіі, розныя формы групавой работы ("снежны камяк" (або піраміда), мазгавы штурм (мазгавая атака, брэйншторминг), "гудучыя" групы, "акварыум" і інш.). Асноўныя характарыстыкі тэхналогіі дыстанцыйнага навучання абумоўліваюць і адмысловы тып выкладчыка, занятага ў гэтай сістэме.

На думку многіх экспертаў, выкладчык, які працуе ў рэжыме дыстанцыйнай падрыхтоўкі, вызначаецца прафесіяналізмам, высокім метадычным майстэрствам, пачуццём навізны і актуальнасці, зразумелым стылем выкладу матэрыялу, арыентацыяй на развіццё самастойнай работы студэнтаў. Калі зыходзіць з прапанаванай тэорыі вучэбнай дзейнасці, становіцца відавочным, што пры праектаванні мадэлі дыстанцыйнага навучання выкладчыку ВНУ адводзіцца каардынуючая роля працэсам самаразвіцця асобы студэнта. Прызначэнне ж педагагічнага працэсу, педагагічнай дзейнасці заключаецца ў стварэнні найбольш аптымальных умоў для самаразвіцця, развіцця індывідуальнасці чалавека. Такім чынам, сутнасць дыстанцыйнага навучання, яго мэта бачацца нам у стварэнні прыродаадпаведных умоў самаразвіцця індывідуальнасці, суб'ектнасці чалавека.

На нашу думку, уяўляюць вялікі інтарэс даследаванні, праведзеныя ў British Open University, якія дазволілі вылучыць найбольш істотныя прыметы, характэрныя для дыстанцыйных тэхналогій: багаты арганізацыйна-метадычны інструментарый, эканамічнасць, алгарытмізацыя, праектуемасць, цэласнасць, кіруемасць, карэкціруемасць, выніковасць. Аднак найперш у дыстанцыйнай адукацыі вядучая роля належыць самаразвіццю асобы (фарміраванню ёю ўласнай свядомасці і самастойнасці) у працэсе вучэбнай дзейнасці, якая разгортваецца як канструктыўны дыялог, ці хутчэй палілог, яе саўдзельнікаў. Зыходзячы з гэтага, неабходна ўлічваць у дыстанцыйнай адукацыі наяўнасць усіх кампанентаў эмпатыйнай педагогікі – такі падыход,

заснаваны на сімпатыі, прыязнасці, падтрымцы, далікатных, паважлівых адносінах да ўсіх удзельнікаў адукацыйнай сферы вышэйшай школы.

Яшчэ адзін праект дыстанцыйнага навучання быў рэалізаваны ў 2005-м годзе выкладчыкамі Цэнтра філалагічных паслуг філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта на базе ліцэя БДУ (кіраўнік праекта – дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Белдзяржуніверсітэта Т. У. Ігнатовіч), юрыдычнага каледжа БДУ (кіраўнік праекта – дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Белдзяржуніверсітэта Т. У. Рубанік), агульнаадукацыйных устаноў горада Мінска і Мінскай вобласці (кіраўнік праекта – дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Белдзяржуніверсітэта В. У. Праскаловіч, дырэктар Цэнтра). Мэтаю яго была дыстанцыйная падрыхтоўка навучэнцаў названых устаноў да ўступных выпрабаванняў у Беларускі дзяржаўны універсітэт, цэнтралізаванага тэставання па філалагічных дысцыплінах.

Прааналізаваўшы сучасны стан выкладання філалагічных дысцыплін, методыку іх выкладання і свой уласны педагагічны вопыт, аўтары праекта палічылі цікавым і мэтазгодным арганізаваць навучанне на падрыхтоўчых курсаў у адпаведнасці з новай педагагічнай парадыгмай адукацыі. Нам удалося ажыццявіць ідэі ўласнай метадычнай думкі, абапіраючыся на "халістычны" (ад грэч. "colon" і азначае "Сусвет як цэлае"; тое, што не дзеліцца на часткі) прынцып у адукацыі. Спецыфіка метадалогіі міждысцыплінарных ведаў заключаецца ў вяршэнстве інтэгратыўных, сінтэзуючых тэндэнцый. Такі падыход садзейнічае аднаўленню цэласных уяўленняў аб Сусвеце, карціны свету як адзінага працэсу: "Усё ёсць усё, усё ёсць ва ўсім, усё ёсць заўсёды, усё ёсць усюды" (чацвярычны прынцып мудрацоў Старажытнага Усходу). Увядзенне "халістычнага" прынцыпу адукацыі дасць магчымасць ажыццявіць якасныя ўнутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі, з’явіцца стымулам да творчасці ўсіх удзельнікаў адукацыйнай прасторы.

Вызначыўшы этапы інсталяцыі і адаптацыі сучасных інфармацыйных тэхналогій на інтэграваных занятках з мэтай стварэння ўмоў для ўсебаковага развіцця асобы навучэнца і надання імпульсаў ягонай пазнавальнай дзейнасці, перад аўтарамі праекта паўстала праблема пошуку і распрацоўкі вучэбна-метадычных матэрыялаў па філалагічных дысцыплінах.

У рамках праекта былі створаны вучэбныя дапаможнікі для паступаючых у ВНУ па рускай і замежных мовах, беларускай і рускай літаратуры з выкарыстаннем тэстаў, электронных падручнікаў. У новай дыстанцыйнай адукацыі на падрыхтоўчых курсах Цэнтра ўкаранёны электронныя падручнікі з выкарыстаннем камп’ютэрных метадаў тэставання ведаў навучэнцаў. Характэрная іх асаблівасць заключаецца ў тым, што электронныя падручнікі для дыстанцыйнай падрыхтоўкі могуць сыграць ролю рэпетытараў, якія дапамагаюць навучэнцам у вывучэнні філалагічных дысцыплін. Кансультацыі выкладчыкаў пры гэтым пераносяцца на абмеркаванне індывідуальных заданняў з улікам інтарэсаў абітурыентаў.

Па водзывах навучаемых на падрыхтоўчых курсах, заняткі ў фармаце дыстанцыйнага навучання, а таксама ў мультымедыйнай лабараторыі даюць магчымасць арганізаваць самастойныя дзеянні кожнага курсанта, палепшыць якасць іх падрыхтоўкі да ўступных іспытаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Варта таксама адзначыць, што выкарыстанне найноўшай тэхналогіі адукацыі як у Расіі, так і Беларусі, на жаль, моцна адстала ад Захаду, па прычыне таго, што ў 50-я гг. XX ст. кібернетыка была аб'яўлена савецкай уладай "буржуазнай псеўданавукай". Таму сёння цяжка гаварыць аб якім-небудзь міжвузаўскім супрацоўніцтве або, тым больш, канкурэнцыі ў гэтай сферы адукацыі. Тым не менш у многіх адукацыйных установах нашай рэспублікі (да прыкладу, у Беларускім дзяржаўным універсітэце) ажыццяўляецца вялікая арганізацыйная работа і распрацоўваецца кантактна-дыстанцыйная сістэма адукацыі, для чаго ўжо створаны ў камп'ютэрным варыянце падручнікі для розных прадметных абласцей. Развітая сетка камунікацый і наяўнасць неабходных адукацыйных сервераў у сетцы Інтэрнэт зрабілі рэальнасцю распаўсюджанне новых тэхналогій дыстанцыйнай адукацыі. Поўны пераход на сістэму дыстанцыйнай адукацыі магчымы, але дастаткова праблематычны, у выпадку атрымання вышэйшай адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі, што звязана з аб'ектыўнасцю ацэньвання і неабходнасцю для шэрага прадметных абласцей вочнай дэманстрацыі прафесійных навыкаў (педагогіка, медыцына і г. д.). Дадатковая адукацыя або павышэнне кваліфікацыі менш патрабавальныя па сваіх уласцівасцях да кантролю якасці засвоенага матэрыялу ў працэсе навучання. Большая доля адказнасці ўскладваецца на навучаемага, таму спектр структурных варыянтаў сістэмы дыстанцыйнай адукацыі значна шырэйшы.

Такім чынам, дыстанцыйнае навучанне сёння – гэта рэальнасць. Атрымаўшы шырокае развіццё на Захадзе, дыстанцыйная падрыхтоўка знаходзіць усё большае распаўсюджанне і прызнанне і ў нашай краіне. Як сведчыць статыстыка, цікавасць нашых грамадзян да сістэмы дыстанцыйнай адукацыі ўзрастае з кожным годам, асабліва ў рэгіёнах. Дарэчы, дыстанцыйная адукацыя задумвалася англічанамі *(<u>гістарычная даведка</u>: сістэма "адкрытых універсітэтаў" узнікла ў Англіі ў 1969 г. па ініцыятыве прэм'ер-міністра Г. Вільсана)* менавіта для навучання "простага народа з правінцыі". Падобная форма навучання неперасўзыдзеная асабліва для тых, у каго няма часу і магчымасці, каб зрабіць перапынак у кар'еры для атрымання вышэйшай адукацыі. Найноўшая педагагічная тэхналогія дала магчымасць вучыцца дома ў зручны для студэнтаў і навучэнцаў час. Гэта асабліва важна для асоб з абмежаванымі магчымасцямі. Новая тэхналогія аказалася перспектыўнай і была сустрэта выкладчыкамі і адміністрацыяй шэрага навучальных устаноў з вялікім энтузіязмам.

У стандартнай адукацыі, або адукацыі па сістэме face to face, выкарыстоўваецца ўсё ж такі нейкі ўсярэднены падыход, і толькі на старэйшых курсах ВНУ ў студэнтаў з'явіцца навуковы кіраўнік, які даводзіць

ступень адукаванасці студэнта да адпаведнага ўзроўню, індывідуалізуе навучанне канкрэтнага чалавека. У адрозненне ад гэтага дыстанцыйная адукацыя дазваляе пабудаваць фактычна для кожнага навучаемага сваю індывідуальную траекторыю адукацыі, прайсці яе, звяртаючыся да створанага інфармацыйнага асяроддзя, задавальняючы свае асабістыя патрэбнасці ў адукацыйных паслугах у тым рэжыме, у якім гэта найбольш зручна і камфортна.

І хаця сучасныя цэнтры дыстанцыйнай адукацыі пакуль яшчэ недастаткова дасканалыя, аднак, можна з упэўненасцю сказаць, што гэта прадвеснікі адукацыі будучага.

**Літаратура**

1. *Полат, Е. С., Моисеева, М. В.* Дистанционное образование: учеб. пособие для вузов / Е. С. Полат, М. В. Моисеева. – М., 1998.

2. *Романов, А. И., Торопцов, В. С.* Технология дистанционного обучения в системе заочного экономического образования / А. И. Романов, В. С. Торопцов. – М., 2000.

3. *Тихомиров, В. П.* Развитие дистанционного образования / В. П. Тихомиров. – М., 1996.